ПАВЕТРАНАЯ ВАРТА

(Заканчэнне. Пачатак на 3-й стар.)

— І тыя крокі, якія мы робім, дазваляюць нам ажыццяўляць узаемнае інфармаванне аб паветраным становішчы як на тэрыторыі Расійскай Федэрацыі, так і на тэрыторыі Беларусі: усё, што мы бачым на тэрыторыі сумежных дзяржаў, мы перадаём на камандныя пункты Расіі. Гэты абмен дазваляе нам своечасова прымаць рашэнні па супрацьпаветранай абароне.

АД КАМАНДЫ ДА ЎЗЛЁТУ — 15 ХВІЛІН

Сталі мы сведкамі і іншага эксперымента. Узнікла ўмоўная пагроза. Пасля аб'яўлення трывогі да двух знішчальнікаў «МіГ-29», якія чакалі свайго часу на ўзлётнай паласе, падбеглі лётчыкі і тэхнічны склад. Неўзабаве самалёты былі прыведзены ў гатоўнасць і накіраваліся на ўзлётна-пасадачную паласу. Ад каманды да ўзлёту прайшло ўсяго 15 хвілін!

— Пры абвастрэнні становішча або пры выяўленні парушальніка паветранай прасторы краіны дзяжурныя сілы пераводзяцца ў больш высокія ступені баявой гатоўнасці, — патлумачыў камандуючы ВПС і СПА. — Поўны баявы разлік прыбывае на камандны пункт, куды з цэнтральнага каманднага пункта паступаюць каманды па прымяненні зброі. Пасля пастаноўкі задач разлік знішчальнай авіяцыйнай базы арганізуе перавод дзяжурных самалётаў у гатоўнасць №1 і вывад іх у раён магчымага парушэння дзяржаўнай мяжы або ў раён знаходжання парушальніка ў паветранай прасторы Рэспублікі Беларусь.

Адным словам, праца не з лёгкіх. Прычым калі пяць гадоў таму ў паветранай прасторы Беларусі штодзень знаходзілася каля 500 паветраных судоў, то цяпер іх больш як дзве тысячы амаль кожны дзень. Інтэнсіўнасць палётаў павялічылася ў пяць разоў. У выхадныя дні колькасць палётаў праз паветраную прастору нашай краіны становіцца большай на 400—500 паветраных судоў.

СЛУЖБА Ў АРМІІ — СПРАВА НЕ ЖАНОЧАЯ

Мы зноў на аэрадроме. Нас аглушыла: жалезныя птушкі пранесліся побач і разам падняліся ў паветра, дэманструючы нам парны палёт. Затым знішчальнікі «Су-25» атакавалі зенітныя ракетныя комплексы «Тор-М2». Вядома, умоўна. Апошнія, у сваю чаргу, «захоплівалі» і «знішчалі» паветраныя цэлі. «Не дай Бог тут аказацца падчас сапраўднага бою! — быццам прачытаў мае думкі **намеснік камандуючага ВПС і СПА — начальнік авіяцыі палкоўнік Аляксандр КАРАЎ.** — Гэта дуэльная сітуацыя, так званы супрацьпаветраны бой».

Нас аглушыла: жалезныя птушкі пранесліся побач і разам падняліся ў паветра, дэманструючы нам парны палёт. Затым знішчальнікі «Су-25» атакавалі зенітныя ракетныя комплексы «Тор-М2». Вядома, умоўна.

— Баявая машына «Тор-М2» з'яўляецца сумесным праектам Расійскай Федэрацыі і Рэспублікі Беларусь, — удакладніў Алег Двігалеў. — Мы працягваем закупку батарэй «Тор-М2» для зенітных ракетных войскаў. Акрамя таго, завяршаем практычную рэалізацыю закупкі першага звяна вучэбна-баявых самалётаў «Як-130», якія ў будучыні павінны замяніць самалёты «Л-39», што стаяць у нас на ўзбраенні. Літаральна нядаўна нашы лётчыкі і тэхнікі выехалі ў Расійскую Федэрацыю, дзе ўжо праходзяць навучанне і разам з самалётамі ў красавіку ажыццявяць перабазаванне на аэрадром Ліда. У планах узаемадзеяння з Расіяй у нас таксама прадугледжана закупка новай трохкаардынатнай сістэмы «Праціўнік» для радыётэхнічных войскаў. Таксама працягнем закупку і нашых беларускіх радыёлакацыйных станцый «Усход» і «Раса». Яшчэ адным кірункам у развіцці ВПС і войск СПА стане пастаўка чатырох зенітных ракетных дывізіёнаў «С-300».

...Мы з захапленнем назіралі за крылатымі машынамі, якія імгненна праносіліся літаральна над нашымі галовамі. Бяспечней, праўда, за ўсім гэтым было назіраць з экрана баявых машын «Тор-М2». Разам з вайскоўцамі мы паспелі ацаніць становішча, прасачылі за працай баявых разлікаў. А дзяўчаты, у тым ліку я, нават змаглі пакіраваць баявой машынай. Дарэчы, нічога складанага: газ і тормаз, аўтаматычная каробка перадач. Вось і вер цяпер, што служба ў арміі — справа не жаночая. Праўда, педалі былі «цвердаватымі»: не для дзявочых ног дакладна. Ды і не трэба: ваеннай тэхнікай павінны кіраваць мужчыны, а яны якраз з гэтым спраўляюцца годна, як і ўвогуле з пастаўленымі задачамі.

Вераніка КАНЮТА,

Мінск — Баранавічы — Мінск.

Дуэльная сітуацыя: «Су-25» супраць «Тор-М2».

Фота Аляксандра ШАБЛЮКА.

Захаваць для нашчадкаў

У папулярным у савецкі час штотыднёвіку «Неделя» пранікнёнымі радкамі маскоўскага паэта Марка Максімава суправаджаўся фотарэпартаж В.Ахломава, надрукаваны ў маі 1966 года і прысвечаны адкрыццю ў Оршы Кургана Бессмяротнасці. Тады пра гэту значную падзею пісалі амаль усе газеты: ад мясцовага «Ленінскага прызыву» (цяпер «Аршанская газета») да галоўнай партыйнай газеты краіны «Правды». Так, у Дзень Перамогі, у паўночнай частцы Оршы, у толькі што закладзеным Мемарыяльным парку Герояў быў урачыста адкрыты Курган Бессмяротнасці — адзін з першых у Беларусі.

Ідэя ўзвядзення рукатворнага манумента народнай памяці і славы належыць камсамолу Беларусі. Яе горача падтрымала партыйная арганізацыя горада, працоўныя Оршы. У гонар закладкі кургана 16 красавіка адбыўся 10-тысячны мітынг. На ім быў зачытаны тэкст пісьма нашчадкам, якое заклалі ў герметычную шкатулку і змясцілі ў падножжа кургана.

У сціслыя тэрміны трэба было ўзвесці велічны курган. Вялікім быў працоўны энтузіязм аршанцаў. Да стварэння кургана далучыліся літаральна ўсе гараджане: аўтамабілісты і чыгуначнікі, працаўнікі заводаў і фабрык, школьнікі і навучэнцы. У вёдрах, кошыках, спецыяльных каробках, дастаўленых з ільнокамбіната, неслі сюды зямлю ветэраны і моладзь, рабочыя і настаўнікі, жыхары навакольных вёсак. Менш чым за тры тыдні Курган Бессмяротнасці быў насыпаны. У шасці напрамках ад яго былі пракладзены алеі: цэнтральная — Невядомага салдата, астатнія — імя Героя Савецкага Саюза, якія вызначыліся пры вызваленні Аршаншчыны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў: Канстанціна Заслонава, Юрыя Смірнова, Ганны Нікандравай, Сяргея Міта, Марселя Лефеўра.

Урачыстае адкрыццё Кургана Бессмяротнасці адбылося 9 Мая. На мітынг прыйшлі тысячы і тысячы людзей. Не толькі гараджане і жыхары Аршанскага раёна, а і госці з Віцебска, Мінска, Масквы... Ураджэнкай Аршаншчыны, абаронцаў Брэсцкай крэпасці Н.Кантроўскай была прывезена капсула з зямлёй легендарнай цытадэлі над Бугам. Была дастаўлена сюды і зямля з магіл славутых партызанскіх камандзіраў Канстанціна Заслонава і бацькі Міная (Шмырова).

Свяшчэнным стаў для аршанцаў Курган Бессмяротнасці. Доўгія гады Мемарыяльны парк Герояў быў месцам сустрэч ветэранаў вайны з моладдзю. Да пабудовы ў 1978 годзе ў цэнтры Оршы памятнага знака ў гонар вызваліцеляў тут адбываліся галоўныя гарадскія ўрачыстасці з нагоды святкавання Дня Перамогі і Дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

22 жніўня 2000 года падчас нябачанага раней урагану амаль 80% дрэў у парку былі павалены. Сіламі моладзі горада былі пасаджаны маладыя дрэвы, добраўпарадкаваны алеі, устаноўлены новыя ліхтары, асфальтавае пакрыццё заменена на больш прывабную плітку. У 2013 годзе побач з курганам была ўсталявана дывізійная гармата Д-44 (85мм) у гонар палеглых воінаў, якія вызвалялі Оршу ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у складзе 83-га гаўбічнага артылерыйскага палка. У 2014 годзе да яе дабавіліся яшчэ тры адзінкі бронетэхнікі 1940—1960-х гадоў.

Хочацца спадзявацца, што напярэдадні 70-годдзя Вялікай Перамогі яшчэ прыгажэй і ўтульней стане ў Мемарыяльным парку Герояў. Падтрыманне яго ў належным і годным стане — наша сціплая даніна памяці загінулым абаронцам Айчыны, пачэсная справа ўсіх прадпрыемстваў і жыхароў ордэнаноснай Оршы.

Віктар ЛЮТЫНСКІ, краязнавец.

г.Орша.

■ Творчыя матывы

Подзвіг на сцэне

У афішы Драматычнага тэатра беларускай арміі — новы спектакль. «Я — твой афіцэр...» — пастаноўка пра сучасную армію, сённяшніх маладых афіцэраў, патрыятызм, цяжкія будні вайскоўцаў, сяброўства, каханне... Пра асабісты выбар, які часам тычыцца жыцця і смерці.

Перад такім выбарам стаяць тры маладыя сапёры. Косця Сакалоў, Саша Іваноў і Цімур Зямны служаць у адной часці. Яны па-рознаму праводзяць вольны час, сустракаюцца з дзяўчатамі і ўвесь час захапляюцца сваім сябрам Антонам. Яго смерць становіцца асабістым болем кожнага з лейтэнантаў. Адзін з іх павінен выправіць памылку саслужыўца...

Хто гэта будзе? Яны вырашаць самі. Адзін скажа, што ён, бо, маўляў, сірата, і аб ім не будзе каму гараваць. Другому, расчараванаму ў каханні, таксама няма чаго губляць. А трэці на паўшляху ў бальніцу да хворай маці вяртаецца назад. Такі выбар кожнага з іх. Выбар патрыёта, адважнага афіцэра сваёй краіны.

Па словах **мастацкага кіраўніка тэатра Марыны Дударавай**, асноўная задума пастаноўкі пераклікаецца з галоўнай ідэяй усяго чалавецтва — здольнасцю да самаахвяравання.

— Гэты спектакль не толькі пра сучасную армію, — лічыць мастацкі кіраўнік тэатра. — Гэты спектакль пра сяброўства, каханне, разуменне таго, што ў жыцці ёсць каштоўнасці, якія ва ўсе часы ляжаць на паверхні. Пра тое, што і ў наш час ёсць людзі, здольныя на подзвіг. І ён павінен быць на сцэне. Подзвіг менавіта ў сённяшні час.

Дарэчы, вельмі даўно ў рэпертуары тэатра не было пастаноўкі аб сучаснай арміі. Як прызналіся арганізатары, вельмі складана было знайсці матэрыял. Але ўсё ж такі ён знайшоўся: спектакль пастаўлены па матывах п'есы Аркадзя Пінчука «Лейтэнанты». У пастаноўцы выкарыстаны ўсе тэхнічныя магчымасці тэатра, у тым ліку відэа. А па-іншаму паказаць працу сапёраў у тэатры складана.

— Паставіць спектакль аб сучаснай арміі — задача не з лёгкіх, — перакананы **галоўны рэжысёр Драматычнага тэатра беларускай арміі, рэжысёр-пастаноўшчык спектакля «Я — твой афіцэр...» Ігар ФІЛЬЧАНКОЎ**. — Я служыў 30 гадоў таму, а цяпер іншая армія і юнакі іншыя. Аднак акцёры з задачай справіліся. Калі мы пачалі рэпетаваць п'есу, я хацеў на тры месяцы аддаць хлопцаў у вайсковую часць, каб яны там прайшлі курс маладога байца. Праўда, страявой падрыхтоўкай мы займаліся тут. Выпрацоўвалі камандны голас, вучыліся, як правільна аддаваць рапарт. А чаму спектакль менавіта пра сапёраў? Проста гэта людзі, якія ў мірны час атрымліваюць баявыя ўзнагароды. Яны ўвесь час ходзяць па вастрыні нажа, паміж жыццём і смерцю.

Пастаноўка «Я — твой афіцэр...» у першую чаргу арыентавана на маладзёжную аўдыторыю. «Каб маладыя юнакі, якія заканчваюць школу і выбіраюць свой жыццёвы шлях, убачылі на свае вочы, што такое армія, — мяркуе галоўны рэжысёр. — У кожнага, вядома, свой выбар. Але чым больш ведаеш, тым ён шырэйшы».



Фота Яўгена ДОЎГАЛЯ.

Вераніка КАНЮТА.

■ Ваенная медыцына

ТУТ І ДАГЭТУЛЬ ЖЫВЕ ВАЙНА...

Двойчы на працягу некалькіх тыдняў давялося мне лячыцца ў Гомельскім абласным клінічным шпіталі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. І мне здалося, што тут і дагэтуль жыве... вайна.

Не толькі таму, што яе суровым напамінам з'яўляецца баявая (не муляж!) гармата ваенных часоў, якая, можа, дайшла да Варшавы ці Прагі, а цяпер нібыта прытаілася ў масіве стромкіх меднаствольных соснаў, што падступаюць да самых карпусоў (на тэрыторыі шпіталя яна ўстаноўлена з дазволу міністра абароны як сімвал баявой славы, адвагі, майстэрства медыкаў і воінаў). Яшчэ і таму, што вайна — у смыленні цялесных і душэўных ран, што нават праз многа гадоў не даюць спакою ветэранам у іх трывожных паўснах, у якіх пад смяротным агнём яны ідуць у атаку, выбіваюць ворага з занятай вышыні, змахваюць слёзы над целамі палеглых сяброў-аднапалчан. Тыя ўспаміны, праплываючы адзін за адным, глухім болем аддаюцца ў сэрцах гэтых, безумоўна, мужных, асаблівага складу людзей, і таму яны ў тых паўснах не-не ды ўздрыгнуць, прастогнуць і прачнуцца, каб ужо да раніцы не заплюшчыць вачэй. А потым, можа, падыдуць да той гарматы і моўчкі пастаяць каля яе...

НІХТО НЕ ЗАБЫТЫ, НІШТО НЕ ЗАБЫТА

Ніяк не сціраецца з памяці Уладзіміра Пузанава, які ў 20 гадоў камандаваў танкавым узводам, выпадак, як на Днепрапятроўшчыне вораг вывеў яго баявую машыну са строю, а сам ён атрымаў кулявое раненне. Танк загарэўся ад прамога попадання снарада нямецкай самаходкі. Радыст экіпажа загінуў, механіку адарвала нагу, наводчык быў паранены ў плячо, а камандзір — у руку і нагу. Дарэчы, у яго пад каленкай і дагэтуль сядзіць асколак, які чапаць нельга.

З такім жа асколкам, таксама ў назе, жыве і 91-гадовы заслужаны лесавод Беларусі, доктар сельскагаспадарчых навук прафесар Аляксандр Кажэўнікаў, які дабравольцам уступіў у рады Чырвонай Арміі і ваяваў спачатку стралком і наводчыкам 82-міліметровага мінамёта пад Сталінградам, а затым — пад Ленінградам. Самая высокая яго салдацкая ўзнагарода — медаль «За адвагу».

— Смерць заўсёды хадзіла побач з намі, — расказваюць Іван Дзямехін, які ваяваў у складзе Бранскага, 1-га, 2-га, 3-га Беларускіх франтоў, ва Усходняй Прусіі, быў паранены ды зноў уступіў у строй, партызан-разведчык Міхаіл Нікіценка, які быў кантужаны, атрымаў раненне ў прамой сутычцы з фашысцкімі разведчыкамі і прайшоў усю вайну, вярнуўшыся дадому толькі ў 1947 годзе, і былы стралок асобнай парашутна-дэсантнай роты, а затым карэкціроўшчык артылерыйскага агню Аляксандр Прыходзька, які ваяваў ва Украіне, пад Сталінградам, у Малдавіі, Венгрыі, Аўстрыі, Чэхаславакіі і Германіі. У яго таксама — і раненні, і кантузіі, і баявыя ўзнагароды.

Не пазайздросціш лёсу Зінаіды Кашубінай з Дубровенскага і Марыі Карыка з Хойніцкага раёнаў, якія ва ўзросце пяці і дванаццаці гадоў разам з маці, малымі брацікамі і сястрычкамі апынуліся ў Германіі спачатку ў канцлагерах, а затым — у маёнтках баўэраў, дзе напоўніцу зведалі як голад і холад, так і хваробы, цяжкую працу.

А вось інвалід Аляксей Абібак з Петрыкаўскага раёна дапамагаў фронту снарадамі, працуючы падлеткам па 12 гадзін у суткі то днём, то ноччу на ваенным заводзе ў Чалябінскай вобласці. Малады арганізм пасля такой работы патрабаваў аднаўлення сіл. Толькі выдадзенага пайка не хапала: даводзілася цярпець. І толькі калі немцаў разграмілі пад Сталінградам, той паёк стаў больш каларыйным.

АД СЭРЦА — ДА СЭРЦА

Што і казаць, вялікі сёння ўзрост у франтавікоў Вялікай Айчыннай вайны, былых вязняў фашысцкіх лагераў, працаўнікоў тылу. Ад хвароб нікуды не падзецца. Добра, што ёсць такі шпіталь, дзе і падлячыцца можна, і пабыць у атмасферы асаблівай цеплыні і сардэчнасці, якая пануе тут.

Дарэчы, шпіталь быў створаны ў жніўні 1941 года ў горадзе Бійску Алтайскага краю. Як эвакуацыйная медыцынская ўстанова ён змяшчаўся ў прыстасаваных будынках інтэрнатаў, гасцініцы, школы, і ўжо ў першыя месяцы вайны быў перапоўнены байцамі, якіх дастаўлялі сюды з палёў бітваў.

Калі ж вораг пакаціўся на Захад, на парадак дня паўстала пытанне аб перадыслакацыі шпіталя бліжэй да фронту, у Гомель. Паколькі горад над Сожам быў ушчэнт разбураны, лячэбная ўстанова размясцілася ў некалькіх памяшканнях (нават былой нямецкай стайні), у якіх не было ні вокнаў, ні дзвярэй. Калектыў медыкаў на некалькі месяцаў ператварыўся ў тынкоўшчыкаў, цесляроў, муляраў і іншых рабочых. Як сёння вядома, медыкі адпрацавалі на аднаўленні горада 2500 чалавекадзён і здалі ў фонд абароны краіны 74 тысячы рублёў. У студзені 1945 года шпіталь пачаў ужо прымаць параненых.

І толькі ў 2006 годзе на новым месцы, сярод сасновага бору, з'явіўся сучасны шпіталь. Ён неаднаразова мяняў свой профіль, удасканальвалася сістэма медыцынскай дапамогі і рэабілітацыі інвалідаў Вялікай Айчыннай вайны. За час існавання стацыянарна тут пралячылася звыш 400 тысяч чалавек.

— Цяперашнія пацыенты — не толькі ветэраны вайны? — пытаюся ў галоўнага ўрача шпіталя Алега Іванцова.

— Сёння мы аказваем медыцынскую дапамогу інвалідам, удзельнікам Вялікай Айчыннай вайны, блакаднікам Ленінграда, былым вязням фашысцкіх канцлагераў, турмаў, гета, працаўнікам франтавога тылу, членам сем'яў загінулых ваеннаслужачых, воінам-інтэрнацыяналістам. А пры наяўнасці свабодных месцаў — і адзінокім грамадзянам пажылога ўзросту, чарнобыльцам. На платнай аснове займаемся лячэннем і замежных грамадзян. Мінулы год быў самым рэкордным за час існавання шпіталя: у нас пралячылася 11 786 пацыентаў, каля чвэрці з іх — удзельнікі вайны.

— Згодна з канцэпцыяй Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, сучасная бальніца павінна выконваць чатыры функцыі: лячэбную, прафілактычную, вучэбную і навукова-даследчую. Якія з іх характэрныя для шпіталя?

— У нас функцыянуюць тры тэрапеўтычныя і два неўралагічныя аддзяленні, аддзяленні пасляінсультнай, пасляінфарктнай, анкалагічнай і паслятраўматалагічнай рэабілітацыі, рэабілітацыі пацыентаў неўралагічнага профілю, аддзяленне рэанімацыі і інтэнсіўнай тэрапіі. Таксама працуюць шматлікія самастойныя кабінеты і параклінічныя аддзяленні. У апошні час у практыку ўкаранёны дзясяткі самых дасканалых метадаў дыягностыкі і лячэння, рэгулярна абнаўляецца парк медыцынскай апаратуры і тэхнікі, сярод іх і такія, якіх не маюць іншыя лячэбныя ўстановы Гомельшчыны. У сценах шпіталя акумуляваны багаты практычны вопыт, у якім увасоблены апошнія дасягненні навукі.

— Ваш калектыў і сёння мужна змагаецца за здароўе людзей?

— Сумненняў у гэтым няма. Я ўвогуле ім ганаруся. І на гэта ёсць усе падставы: 92 працэнты ўрачэбнага персаналу з'яўляюцца атэставанымі спецыялістамі, а сярод медыцынскіх сясцёр гэты паказчык складае 84 працэнты. Не атэставаны пакуль толькі тыя кадры медыкаў, якія прыйшлі да нас нядаўна. Наперадзе вялікі пласт работы, якую, як і раней, будзем выконваць добрасумленна.

Уладзімір ПЕРНІКАЎ,

г. Гомель.

■

Галоўны ўрач Алег ІВАНЦОЎ і загадчык другога тэрапеўтычнага аддзялення Фелікс КАЛІНОЎСКІ гутараць з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны і вязнем фашысцкага канцлагера.

ОАО «Завод «Легмаш»

Учетный номер плательщика: 300228934
Вид экономической деятельности: пр-во машин и оборудования для металлургии
Организационно-правовая форма: ОАО
Орган управления: ОАО «БМЗ-управляющая компания
Единица измерения: млн. руб.
Адрес: Восточный переулок, 17, г. Орша, 211390

БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 31 декабря 2014 г.

АКТИВЫ	Код стр.	На 31 декабря 2014 г.	На 31 декабря 2013 г.
1	2	3	4
I. ДОЛГОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Основные средства	110	102 546	103 448
Нематериальные активы	120	268	2
Доходные вложения в материальные активы	130	2 110	2 143
В том числе:			
инвестиционная недвижимость	131	1 481	1 501
предметы финансовой аренды (лизинга)	132	-	-
прочие доходные вложения в материальные активы	133	629	642
Вложения в долгосрочные активы	140	7 537	10 214
Долгосрочные финансовые вложения	150	8 732	8 732
Отложенные налоговые активы	160	274	295
Долгосрочная дебиторская задолженность	170	705	846
в том числе аккредитивы	171	-	-
Прочие долгосрочные активы	180	14	116
ИТОГО по разделу I	**190**	**122 186**	**125 796**
II. КРАТКОСРОЧНЫЕ АКТИВЫ			
Запасы	210	42 006	33 800
В том числе:			
материалы	211	29 066	23 368
животные на выращивании и откорме	212	-	-
незавершенное производство	213	2 839	3 363
готовая продукция и товары	214	10 101	7 069
товары отгруженные	215	-	-
прочие запасы	216	-	-
Долгосрочные активы, предназначенные для реализации	220	-	5 495
Расходы будущих периодов	230	2 374	475
Налог на добавленную стоимость по приобретенным товарам, работам, услугам	240	-	-
Краткосрочная дебиторская задолженность	250	26 691	19 919
в том числе аккредитивы	251	-	-
Краткосрочные финансовые вложения	260	-	-
Денежные средства и их эквиваленты	270	939	1 644
Прочие краткосрочные активы	280	803	803
ИТОГО по разделу II	**290**	**72 813**	**62 136**
БАЛАНС (190+290)	**300**	**194 999**	**187 932**
СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА	**Код стр.**	**На 31 декабря 2014 г.**	**На 31 декабря 2013 г.**
III. СОБСТВЕННЫЙ КАПИТАЛ			
Уставный капитал	410	47 556	47 556
Неоплаченная часть уставного капитала	420	-	-
Собственные акции (доли в уставном капитале)	430	-	-
Резервный капитал	440	6 106	4 101
Добавочный капитал	450	68 074	71 525
Нераспределенная прибыль (непокрытый убыток)	460	24 198	15 181
Чистая прибыль(убыток) отчетного года	470	-	-
Целевое финансирование	480	-	-
ИТОГО по разделу III	**490**	**145 934**	**138 363**
IV. ДОЛГОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Долгосрочные кредиты и займы	510	7 709	3 081
Долгосрочные обязательства по лизинговым платежам	520	-	-
Отложенные налоговые обязательства	530	-	365
Доходы будущих периодов	540	1 773	351
Резервы предстоящих платежей	550	220	127
Прочие долгосрочные обязательства	560	-	-
ИТОГО по разделу IV	**590**	**9 702**	**3 924**
V. КРАТКОСРОЧНЫЕ ОБЯЗАТЕЛЬСТВА			
Краткосрочные кредиты и займы	610	8 195	4 246
Краткосрочная часть долгосрочных обязательств	620	3 080	6 304
Краткосрочная кредиторская задолженность	630	28 043	33 457
В том числе:			
поставщикам, подрядчикам, исполнителям	631	22 185	13 339
по авансам полученным	632	630	11 558
по налогам и сборам	633	922	3 195
по социальному страхованию и обеспечению	634	1 083	914
по оплате труда	635	2 069	2 394
по лизинговым платежам	636	-	-
собственнику имущества (учредителям, участникам)	637	3	437
прочим кредиторам	638	1 151	1 620
Обязательства, предназначенные для реализации	640	-	-
Доходы будущих периодов	650	45	1 638
Резервы предстоящих платежей	660	-	-
Прочие краткосрочные обязательства	670	-	-
ИТОГО по разделу V	**690**	**39 363**	**45 645**
БАЛАНС (490+590+690)	**700**	**194 999**	**187 932**

ОТЧЕТ О ПРИБЫЛЯХ И УБЫТКАХ за январь–декабрь 2014 г.

Наименование показателей	Код стр.	За январь-декабрь 2014 г.	За январь-декабрь 2013 г.
1	2	3	4
Выручка от реализации продукции, товаров, работ, услуг	010	155 076	137 902
Себестоимость реализованной продукции, товаров, работ, услуг	020	(107 351)	(94 019)
Валовая прибыль (010-020)	**030**	**47 725**	**43 883**
Управленческие расходы	040	(18 588)	(15 489)
Расходы на реализацию	050	(1 693)	(988)
Прибыль (убыток) от реализации продукции, товаров, работ, услуг (030-040-050)	**060**	**27 444**	**27 406**
Прочие доходы по текущей деятельности	070	11 222	7 258
Прочие расходы по текущей деятельности	080	(18 577)	(14 646)
Прибыль (убыток) от текущей деятельности (060+070-080)	**090**	**20 089**	**20 018**
Доходы по инвестиционной деятельности	**100**	**4 976**	**3 459**
В том числе:			
доходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	101	3 917	1 357
доходы от участия в уставном капитале других организаций	102	-	-
проценты к получению	103	3	12
прочие доходы по инвестиционной деятельности	104	1 056	2 090
Расходы по инвестиционной деятельности	**110**	**(10 215)**	**(4 110)**
В том числе:			
расходы от выбытия основных средств, нематериальных активов и других долгосрочных активов	111	(10 147)	(214)
прочие расходы по инвестиционной деятельности	112	(68)	(3 896)
Доходы по финансовой деятельности	**120**	**1 151**	**927**
В том числе:			
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	121	1 151	927
прочие доходы по финансовой деятельности	122	-	-
Расходы по финансовой деятельности	**130**	**(4 170)**	**(3 509)**
В том числе:			
проценты к уплате	131	(3 084)	(2 717)
курсовые разницы от пересчета активов и обязательств	132	(1 086)	(792)
прочие расходы по финансовой деятельности	133	-	-
Прибыль (убыток) от инвестиционной, финансовой и иной деятельности (100-110+120-130)	**140**	**(8 258)**	**(3 233)**
Прибыль (убыток) до налогообложения (090+140)	**150**	**11 831**	**16 785**
Налог на прибыль	160	(3 551)	(4 700)
Изменение отложенных налоговых активов	170	(20)	295
Изменение отложенных налоговых обязательств	180	365	(66)
Прочие налоги и сборы, исчисляемые из прибыли (дохода)	190	-	-
Прочие платежи, исчисляемые из прибыли (дохода)	200	(212)	(123)
Чистая прибыль (убыток) (150-160+170+180-190-200)	**210**	**8 413**	**12 191**
Количество прибыльных организаций	211	1	1
Сумма прибыли	212	8 413	12 191
Количество убыточных организаций	213	-	-
Сумма убытка	214	-	-
Результат от переоценки долгосрочных активов, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	220	-	12 305
Результат от прочих операций, не включаемый в чистую прибыль (убыток)	230	-	-
Совокупная прибыль (убыток) (210+220+230)	**240**	**8 413**	**24 496**
Базовая прибыль (убыток) на акцию, рублей	250	18	26
Разводненная прибыль (убыток) на акцию, рублей	260	-	-

Руководитель Колос С.Н.
Главный бухгалтер Чайкина В.Г.

5-6. Информация о дивидендах и акциях

Показатель	Единица измерения	С начала года	За аналогичный период прошлого года
Количество акционеров,всего	лиц	6199	6199
в том числе: юридических лиц	лиц	3	3
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц	0	0
в том числе: физических лиц	лиц	6196	6196
из них нерезидентов Республики Беларусь	лиц	0	0
Начислено на выплату дивидендов в данном отчетном периоде	миллионов рублей	581,00	420,00
Фактически выплаченные дивиденды в данном отчетном периоде	миллионов рублей	420,00	1990,00
Дивиденды, приходящиеся на одну акцию (включая налоги)	рублей	6,00	4,33
Дивиденды, фактически выплаченные на одну акцию(включая налоги)	рублей	4,33	4,19
Обеспеченность акции имуществом общества	тысяч рублей	0,31	0,29